ЗАЦВЕРДЖАНА
Старшыня Атэстацыйнай камісіі
В.І.Грамада

“2” ліпеня 2021 г.

# Пытанні да экзамену па атэстацыі на права атрымання пасведчання на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях

1. Абавязкі грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях?
2. Абавязкі і абмежаванне правоў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць?
3. Адметныя вартасці матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей? Натурныя даследаванні, віды, вынікі, задачы і мэты іх выканання? Тэхніка бяспекі пры іх правядзенні?
4. Апішыце тэхналогію рэстаўрацыі ляпнога дэкору?
5. Археалагічныя даследаванні. Якія работы адносяцца да археалагічных палявых работ? Што такое археалагічныя камеральныя работы?
6. Ахова культурнай спадчыны як складовая частка культурнай палітыкі? Юрыдычная ахова культурнай спадчыны?
7. Віды работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Рамонтна-рэстаўрацыйныя і іншыя работы, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях.
8. Віды кроквенных канструкцый помнікаў архітэктуры?
9. Віды работ па інжынерным умацаванні канструктыўных элементаў помнікаў архітэктуры?
10. Віды скляпенняў? Рэстаўрацыя і ўзмацненне скляпеністых перакрыццяў? Тэхналогія іх выканання?
11. Выкананне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленне іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў?

Меры па ахове археалагічных аб'ектаў пры выкананні работ на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў?

12. Выпадкі неабходнасці ўзмацнення цаглянага мура метадам ін'екціравання? Тэхналогія выканання работ?

13. Дзе пралягае храналагічная мяжа паміж культурнай спадчынай і сучаснай архітэктурай?

14. Для чаго створаны Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь? Парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь?

15. З якой мэтай ажыццяўляецца грамадскі кантроль у сферы культуры? Што ўключае ў сябе паняцце ахова гісторыка-культурнай спадчыны?

16. Знешнія прычыны разбурэння помнікаў? Пагрозы захаванню гістарычных гарадоў?

17. Інвентарызацыя гісторыка-культурнай спадчыны: прынцыпы, мэты і задачы? Сучасная метадалогія інвентарызацыі? Улікова-класіфікацыйная дакументацыя па гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь?

18. Інжынернае абследаванне помніка архітэктуры? Асноўныя віды работ? Задачы і метады вывучэння тэхнічнага стану помнікаў архітэктуры?

19. Калі дапускаецца перамяшчэнне нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці? Прадухіленне пагрозы захаванню матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей?

20. Калі неабходна выконваць ўзмацненне падмуркаў? Якія спосабы ўзмацненне падмуркаў існуюць? Тэхналогія выканання работ?

21. Калі неабходна выконваць часовае ўмацаванне аварыйных участкаў драўляных перакрыццяў, аконных і дзвярных перамычак? Спосабы часовага ўмацавання гэтых канструкцый?

22. Кроквенныя сістэмы, іх віды, характэрныя асаблівасці, спосабы іх рэканструкцыі? Традыцыйныя матэрыялы і колеры пакрыцця дахаў?

23. Метадалогія захавання археалагічных мясцін?

24. Метадалогія захавання гістарычных паркаў (культурных ландшафтаў)?

25. Міжнародная правая ахова культурнай спадчыны? Міжнародныя канвенцыі і рэкамендацыі, якія датычацца аховы культурнай спадчыны?

26. Мэты, задачы і склад выканання навукова-даследчых работ? Склад навукова-праектнай дакументацыі?

27. На якія катэгорыі падзяляюцца матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці і па якому прынцыпу? Хто надае катэгорыю

матэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям? Як вядзецца улік гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь?

28. Назавіце асноўныя задачы Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны? Рашэнні па якіх пытаннях прымае Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны? Для чаго і хто стварае саветы па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны?

29. Назавіце віды матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей? Як вядзецца ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь?

30. Назіранне за дынамікай дэфармацый, спосабы і прыёмы, віды маякоў? Прычыны страты канструктыўнай устойлівасці помнікаў архітэктуры?

31. Неабходнасць устанаўлення зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей? Віды зон аховы? Прынцыпы, умовы і задачы іх устанаўлення? Як зацвярджаюцца зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей?

32. Недапушчэнне пагаршэння ўмоў успрымання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей? Якія умовы размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы, якія размяшчаюцца на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях?

33. Падмуркі і сцены помнікаў архітэктуры, іх характэрныя асаблівасці?

34. Паняцце "буранабіўныя каранёвыя палі"? Спосабы іх устройвання?

35. Парадак забеспячэння належнага ўтрымання і выкарыстання матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей?

36. Парадак і ўмовы прыняцця ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, на якой выкананы рамонтна-рэстаўрацыйныя работы?

37. Пошук і выяўленне археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў. Дазвол на права правядзення археалагічных даследаванняў?

38. Спосабы анкероўкі аднаўленых паветраных сувязяў пры правядзенні рэканструкцыі?

39. Спосабы выканання гідраізаляцыі помнікаў архітэктуры?

40. Спосабы узмацнення падмуркаў? Тэхналогія выканання работ?

41. Традыцыйныя віды тынкоўкі? Традыцыйныя пігменты і фарбы, якія выкарыстоўваліся на помніках архітэктуры?

42. У якіх выпадках дапускаецца змяненне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей?

43. Узгадненне навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях?

44. Узмацненне падмуркаў з выкарыстаннем буранабіўных каранёвых паляў?

45. Уладкаванне і аднаўленне паветраных сувязяў пры рэканструкцыі помнікаў архітэктуры?

46. Фіксацыя наяўнага стану аб’екта да пачатку работ: мэты, задачы, метады? Абмерныя работы: віды абмераў, метады і спосабы дакументавання аб’ектаў?

47. Хто можа быць уласнікам гісторыка-культурнай каштоўнасці? Правы ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці?

48. Хто прымае рашэнне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і пазбаўленні матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці? У якіх выпадках можа быць прынята рашэнне аб пазбаўленні матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці?

49. Чаму аднаўленне страчаных аб’ектаў у гістарычных формах не можа з’яўляцца праблемай рэстаўрацыі?

50. Чаму матэрыяльныя культурныя рэсурсы прынцыпова не могуць быць адноўлены? Аўтэнтычнасць (сапраўднасць) аб’екта культурнай спадчыны?

51. Чым гісторыка-культурная каштоўнасць адрозніваецца ад культурнай каштоўнасці? Віды культурных каштоўнасцей?

52. Чым кансервацыя адрозніваецца ад рэстаўрацыі?

53. Што адносіцца да археалагічнай спадчыны? Што адносіцца да археалагічных аб’ектаў?

54. Што адносіцца да археалагічнай спадчыны? Што адносіцца да археалагічных аб’ектаў? Як забяспечыць ахову археалагічнай спадчыны?

55. Што адносіцца да навукова-даследчых работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях пры распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях? Праектныя работы, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях?

56. Што Вы можаце расказаць аб пашпарце матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці? Калі складаецца пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці? Хто забяспечвае складанне пашпарта матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці?

57. Што вызначае гістарычны характар горада або яго часткі?

58. Што з'яўляецца падставай для выбару матэрыялаў для рамонту, рэстаўрацыі і апрацоўцы фасадаў помнікаў архітэктуры? Чаму нельга выкарыстоўваць цэмент пры рэстаўрацыі помнікаў, пры будаўніцтве якіх цэмент не быў ужыты? Прыклады?

59. Што пагражае культурнай спадчыне ў сучасным свеце? Унутраныя прычыны разбурэння помнікаў?

60. Што такое ансамбль культурных каштоўнасцей? Што адносіцца да калекцыі культурных каштоўнасцей? Што з'яўляецца камплектам культурных каштоўнасцей?

61. Што такое Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, хто яго фарміруе і вядзе? Якія раздзелы можа змяшчаць Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь?

62. Як вылучаюцца культурныя каштоўнасці для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці? Што такое прафесійнае выяўленне культурнай каштоўнасці, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці? Што павінна быць зроблена пры прафесійным выяўленні культурнай каштоўнасці, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці?

63. Як забяспечыць ахову археалагічнай спадчыны? Улік археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў?

64. Якія аб'екты лічацца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі? Што адносіцца да матэрыяльных культурных каштоўнасцей?

65. Якія меры па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей прадугледжаны згодна з Кодэксам аб культуры? Як забяспечыць захаванне нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей?

66. Якія работы павінны выконвацца пры праектаванні і выкананні земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, якія могуць стварыць пагрозу захаванню нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей?